23.05.2023 / 19:13 12 Бел Łac Рус

«Гэтая сітуацыя можа пагражаць мне поўным п***цом». Доктарка шклоўскай калоніі, дзе памёр Ашурак, у паніцы хацела звольніцца

«Альянс расследавальнікаў Беларусі» апублікаваў аўдыязапіс, у якім адна з

шклоўскай калоніі ў час смерці Вітольда Ашурка, пасля здарэння моліць свайго знаёмага перавесці яе на новае месца службы. Але былыя палітвязні паведамілі «Нашай Ніве», што жанчына можа ўсё яшчэ працаваць у ПК-17.

Дабрадзеравец Наталля Іванаўна, начальніца медыцынскай часці папраўчай установы ПК-17 у Шклове. Калаж: «Наша Ніва»

У публікацыі «Альянсу расследавальнікаў Беларусі» ад 21 мая фігуруе інфармацыя, што начальніца медыцынскай часці ПК-17 Наталля Дабрадзеравец праз амаль 40 дзён пасля забойства Вітольда Ашурка тэлефануе палкоўніку міліцыі Аляксандру

Дэпартамента фінансаў і тылу МУС, з просьбай тэрмінова перавесці яе са Шклова на іншае месца службы.

Згодна са злітым у сеціва запісам тэлефоннага званка паміж Дабрадзеравец і Казловым, такая спешнасць тлумачыцца «здарэннем са смерцю палітвязня, што з'яўляецца простай недарэчнасцю, але можа абярнуцца поўным п***цом».

> **«У мяне тут на працы нешта незразумелае. Тут неяк усё не складваецца, усё здарылася знянацку. Сітуацыя становіцца настолькі складанай, што нам з Сяргеем, хутчэй за ўсё.**

Гаворка, напэўна, ідзе пра Сяргея Карчэўскага — супрацоўніка ПК-17, якога называюць саўдзельнікам здзекаў з палітвязняў, у тым ліку і з Вітольда Ашурка.

> **«Па сутнасці, адбылася сапраўдная недарэчнасць, аднак гэтая сітуацыя можа пагражаць мне поўным п***цом, калі я застануся, — працягвае яна. — Дый не факт, што мяне адпусцяць, Шклоў — такі аб'ект, што хрэн адпусцяць. У нас якраз ідзе праверка па гэтым палітвязні, і я вельмі**

атрымаецца загладзіць», — кажа Наталля Дабрадзеравец свайму знаёмаму палкоўніку міліцыі Аляксандру Казлову.

Сяргей Карчэўскі — начальнік рэжымнай часці ПК-17 у Шклове. На фота ён, Наталля Дабрадзеравец і іншыя супрацоўнікі калоніі стаяць побач з Вітольдам Ашуркам, які, знясілены, ляжыць на падлозе. Скрыншот з відэа «Альянсу расследавальнікаў Беларусі»

Пры гэтым, паводле поўнага запісу, начальніцу медчасці шклоўскай калоніі вельмі спужала не віна за смерць невінаватага чалавека, а тое, што яна разам з Сяргеем Карчэўскім «падставіла» начальніка ПК-17, які ў адплату за гэта можа «значна пагоршыць іх умовы існавання».

У выніку, як сцвярджае «Альянс расследавальнікаў Беларусі», Наталля Дабрадзеравец неўзабаве змагла звольніцца, але гэтую інфармацыю не пацвярджаюць былыя палітвязні, якія адбывалі свой тэрмін у калоніі Шклова.

> **Некалькі з іх звязаліся з «Нашай Нівай» і паведамілі, што як мінімум на пачатак**

медчасці яшчэ працавала ў ПК-17.

Таксама яны расказалі, што звычайна Наталля Дабрадзеравец перасоўваецца па калоніі толькі ў суправаджэнні Сяргея Карчэўскага, а сама яна «стала вельмі палахлівай у прысутнасці асуджаных».

> **«Гэтая начмед бярэ непасрэдны ўдзел у камісіі па пакаранні асуджаных, якая рэгулярна беспадстаўна адпраўляе палітычных у ШІЗА», — дзеляцца былыя палітвязні.**

Нагадаем, што раней былыя палітвязні таксама дзяліліся падрабязнасцямі пра Вітольда Ашурка і магчымыя абставіны яго гібелі ці забойства.

Інфармацыя ад былых палітвязняў пра Вітольда Ашурка:

- **Былы вязень шклоўскай калоніі расказаў, хто можа быць датычны да гібелі Вітольда Ашурка**
- **«З камеры, дзе сядзеў Вітольд, былі чуваць крыкі». Былы палітвязень расказаў падрабязнасці пра гібель Ашурка**
- **«Мэтай было не забіць, а зламаць маральна». Яшчэ адзін былы вязень**

Нядаўна ў адной з беларускіх калоній загінуў яшчэ адзін палітвязень Мікалай Клімовіч, у якога былі сур'ёзныя праблемы з сэрцам. Абставіны яго гібелі да гэтага часу застаюцца невядомымі.

Палітвязняў утрымліваюць ва ўмовах, роўных катаванню. На Акрэсціна іх утрымліваюць па 25 чалавек у камерах, разлічаных на шасцярых. У калоніях іх беспадстаўна змяшчаюць у ШІЗА, збіваюць, пазбаўляюць перадач, знішчаюць выходную і ўваходную карэспандэнцыю, прызнаюць схільнымі да экстрэмізму. Маюць месца здзекі па нацыянальнай прыкмеце — беларускамоўных вязняў прымушаюць размаўляць і перапісвацца па-руску. Сувязі з некаторымі вязнямі няма месяцамі.

Масавыя палітычныя рэпрэсіі ў Беларусі працягваюцца з 2020 года, калі Аляксандр Лукашэнка, мяркуючы па звестках з участкаў, дзе выбарчыя камісіі дазволілі назіральнікам сачыць за падлікам галасоў, прайграў Святлане Ціханоўскай, але не аддаў уладу.

З 2022 года, пасля нападу Расіі на Украіну, беларусаў пачалі пераследаваць і за антываенныя выказванні або сімпатыі да Украіны.

За гэты час у краіне адбылося не менш за 50 тысяч палітычна матываваных затрыманняў, заведзена не менш за 12 тысяч палітычна-крымінальных спраў і адкінутыя базавыя нормы законнасці і маралі.

ПАДТРЫМАЦЬ

Чытайце таксама:

«Мяне пасадзілі, бо я казаў праўду». Што Вітольд Ашурак напісаў у апошнім лісце да мамы

Колькі палітвязняў памерла ці звяло рахункі з жыццём праз невыносныя ўмовы за кратамі

Былыя зняволеныя заклікаюць закрыць грузавы рух на межах Беларусі, пакуль не будуць вызваленыя палітвязні

Марк Рыхтэр

Хочаш падзяліцца важнай інфармацыяй ананімна і канфідэнцыйна?

Пішыце рэдактару «Нашай Нівы» ў ТГ



ЧЫТАЙЦЕ ЯШЧЭ

КДБ вёў «агентурныя гульні» з удзелам Паротнікава пасля таго, як «Наша Ніва» паведаміла пра яго затрыманне

Улады шукаюць звесткі аб плацяжах беларусаў у замежных інтэрнэт-крамах 2

Прапаганда выпусціла фільм пра аналітыка Андрэя Паротнікава і паказала, як запісвалі размовы з яго тэлефона 6

КАМЕНТАРЫ

Жанна/адказаць

8 1

24.05.2023

↳ Новая Беларусь, чытай далей, бесхрыбетнік. Соплі ўцяні і лепш не лезь да людзей. Сядзі на кухні моўчкі.

азіраецца яна/адказаць

10 0

мярзотна. мярзотна, як яна пра гэта кажа. ні кроплі пакаяння, а наадварот

даведка/адказаць
24.05.2023

2 0

Шклов такой объект, где сам Лукашенко не сидел, а работал заместителем начальника по производству ИК.

ПАКАЗАЦЬ УСЕ КАМЕНТАРЫ

КАМЕНТАВАЦЬ

ІМЯ

Націскаючы кнопкі «Дадаць каментар» азначае згоду з рэкамендацыямі па абмеркаванні.

Спам-фільтр: падлічыце, колькі будзе...

5+12+9= не бачу сімвалы

Прапаганда выпусціла фільм пра аналітыка Андрэя Паротнікава і паказала, як запісвалі размовы з яго тэлефона 6

У Пскове беспілотнікі атакавалі аэрадром — мінімум чатыры самалёты Іл-76 пашкоджаныя 4

КДБ вёў «агентурныя гульні» з удзелам Паротнікава пасля таго, як «Наша Ніва» паведаміла пра яго затрыманне

Беларусь і Украіна былі калоніямі Расіі? А вось і не 7

«Зміралася з такой недарэчнай смерцю». Мінская мадэль ледзь не загінула, катаючыся на вадзе на гідрафойле 5

Пад Баранавічамі прадаецца незвычайны дом у выглядзе карабля

Улады шукаюць звесткі аб плацяжах беларусаў у замежных інтэрнэт-крамах 2

Пасажыр аўтобуса праглынуў на мяжы змесціва свайго кашалька, але гэта яму не дапамагло

Беларуска трапіла на амерыкана-карэйскую «фабрыку зорак». Што пра яе вядома?

Беларус вырабіў сала ў шакаладзе і сабраў у тыктоку больш за мільён праглядаў 1

У Мінску мужчыну арыштавалі на 3

Рокер у карунках. Лявон Вольскі здзівіў

Віктар Лукашэнка выпадкова сказаў праўду / Выбухі на мяжы Беларусі і Украіны / Сусед данёс на суседа. Глядзіце ВІДЭАнавіны за 29 жніўня

выганяць з краіны беларускіх дальнабойнікаў 4

West Point адчынілі знойдзеную ў помніку Тадэвушу Касцюшку «капсулу часу». Знойдзенае здзівіла 5

АПОШНІЯ НАВІНЫ

«Бананавы кароль» Захараў зарубіўся з ДФР і шле Качанавай пакаянныя лісты, называючы апазіцыю «жопазіцыяй» 18

Беларусь увайшла ў топ-5 еўрапейскіх краін з самымі нізкімі цэнамі на кураціну 8

МЗС Польшчы правяло сустрэчу з прадстаўнікамі арабскіх краін наконт уцекачоў з іх на тэрыторыі Беларусі

У цэнтры Мінска рыбак вылавіў 15-кілаграмовага таўсталобіка 2

Спявачка Рыта Дакота трэці раз святкуе вяселле ў новай краіне 5

На пункце пропуску «Катлоўка» 30 жніўня магчымыя перабоі з электрычнасцю

Як агенты трапляюць за мяжу і ці спрабавалі спецслужбісты запісацца ў шэрагі «Кіберпартызан» 3

Беларусу і расіянам з казахстанскага футбольнага клуба дазволяць наведаць Чэхію. Пытанне вырашалася на ўрадавым узроўні

Міжнародная федэрацыя бадмінтона дапусціла беларусаў да спаборніцтваў у нейтральным статусе

Навукоўцы навучыліся рабіць бетон на 30 адсоткаў мацнейшым пры дапамозе адпрацаванай

СТУЖКА НАВІН

КАЛЯНДАР

2022 2023 2024

Ліпень Жнівень Верасень

ПН	АЎ	СР	ЧЦ	ПТ	СБ	НД
	1	2	3	4	5	6
7	8	9	10	11	12	13
14	15	16	17	18	19	20
21	22	23	24	25	26	27
28	29	30	31			



PDF ВЕРСІЯ

Навіны

Улада
Выбары-2020
Эканоміка
Грамадства
Здарэнні
Свет
Спорт
Аўто
Меркаванні

Культура

Гісторыя
Афіша
Музыка
Мова
Кіно
Літаратура
Культура
Тэатр

Навука і тэхналогіі



Дызайн сайта — арт-студыя PRAS

© Усе правы абароненыя. Выкарыстанне платных матэрыялаў забаронена без пісьмовага дазволу. Выкарыстанне бясплатных рускамоўных версій матэрыялаў забаронена без пісьмовага дазволу. Выкарыстанне бясплатных беларускамоўных версій матэрыялаў дазваляецца пры ўмове наяўнасці актыўнай гіперспасылкі на Nashaniva.com у першым абзацы.

